Дзяржаўная ўстанова  адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма»

IX адкрытая абласная краязнаўчая навукова-практычная канферэнцыя
«Край Гарадзенскі»

Секцыя «Літаратурная Гродзеншчына»

# Сэрцам роднага слова краніся

Аўтар работы
Строк Паліна Дзмітрыеўна, 4 клас, ДУА«Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма»

Навуковыя кіраўнікі
Мароз Людміла Іванаўна, настаўнік пачатковых класаў ДУА«Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма»
Строк Алена Аляксандраўна, настаўнік матэматыкі ДУА«Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма»

Слонім, 2022

# Змест


Уводзіны……………………………………………………………........ 1

Біяграфія Ірыны Антонаўны Войтка……………………………………… 6

Творчасць Ірыны Войтка………………………………………………….. 7

Анкетаванне як метад абгрунтавання актуальнасці дадзенага праекта… 10

Спіс выкарыстаных крыніц……………………………………………... 13

Дадатак……………………………………………………………………. 14

# УВОДЗІНЫ

Многае звязвае чалавека з месцам, дзе ён нарадзіўся і вырас. Родны край, яго людзі, прырода, наваколле становяцца часткай чалавечага лёсу. Дзе б мы ні жылі, на якой бы мове ні размаўлялі, Беларусь – наша агульная, вялікая і адзіная Айчына. Месца, у якім мы нарадзіліся, непараўнальнае ні з чым іншым. Гэта наша малая радзіма. А бывае і так, што чалавек па волі лёсу пакінуў родны край і пасяліўся ў іншым, не менш выдатным кутку нашай велізарнай краіны. І зараз ужо іншы край стаў другой малой радзімай. Дзіўны і загадкавы край, у якім я жыву. Немагчыма апісаць словамі бязмежныя палі і лугі, рэкі, азёры, лясы. Кожны куток яго выдатны і шчодры. Тут я нарадзілася. Не менш дзіўныя людзі, якія жывуць побач са мной, больш за тое, яны таленавітыя і пішуць выдатныя вершы. З адной такой паэткай мне давялося пазнаёміцца асабіста.

**Актуальнасць тэмы**

За апошнія гады цікавасць да сацыяльных сетак узрасла ў шмат разоў. У сувязі з вялікім аб'ёмам уцягнутых карыстальнікаў можна лічыць гэты асяродак досыць магутным інструментам для атрымання і сістэматызацыі ведаў. Таму ў наш час, у стагоддзе новых тэхналогій, лірыка мясцовых паэтаў дапамагае ўсім нам не забываць пра тое, што жывыя яшчэ пачуцці спагады, любові да Радзімы, свайго горада і адзін да аднаго. Лічу, што матэрыял маёй працы можа выклікаць цікавасць да паэзіі “малой радзімы”, свайго раёна, горада, таму што побач з намі жывуць людзі, якія валодаюць дзіўным дарам – дарыць сваю душу, думкі, перажыванні і сабе, і навакольным. Хоць яны і не атрымалі сусветную славу, затое яны пішуць вершы, якія бяруць за душу. Мы, на жаль, мала пра іх ведаем, бо ў сучаснай моладзі іншыя інтарэсы і каштоўнасці.

Лічу, што вельмі важна ведаць і чытаць вершы самабытных паэтаў.

У сваёй даследчай працы мне хацелася б расказаць пра таленавітую паэтку-зямлячку Ірыну Антонаўну Войтку і ўвесь сабраны матэрыял сістэматызаваць у выглядзе вэб-сайта.

**Праблема даследавання**: важна вывучаць літаратуру роднага краю, каб мець уяўленне пра асаблівасці сваёй малой радзімы, ганарыцца сваім краем. Літаратура роднага краю – гэта частка нацыянальнай літаратуры.

У сувязі з гэтым, на мой погляд, неабходна прыцягнуць увагу да творчасці мясцовай паэткі, таму што часта мы ўспамінаем пра заслугі грамадзян сваёй краіны вельмі позна, не паспеўшы выказаць словы падзякі за талент, за творчую спадчыну.

**Мэта даследавання**:

даследаваць творчы шлях паэткі-зямлячкі  І.А.Войткі;

папулярызаваць імя паэткі, выклікаць цікавасць навучэнцаў да яе творчасці.

Для гэтага нам неабходна:

стварыць вэб-сайт, які дапаможа нам дамагчыся пастаўленай мэты.

**Задачы даследавання**:

пошук інфармацыі пра жыццё і творчасць паэткі;

вывучэнне вершаў І.А.Войткі і вылучэнне асноўных тэм і матываў яе лірычных твораў;

выхаванне цікавасці да асобы паэткі-зямлячкі;

стварэнне вэб-сайта.

**Аб'ект даследавання**: літаратурнае краязнаўства.

**Прадмет даследавання**: творчая спадчына паэтэсы І. А. Войтка.

Пры напісанні працы выкарыстоўваліся наступныя **метады даследавання**:

аналіз літаратурных вытокаў;

збор, аналіз інфармацыі, яе апрацоўка;

сістэматызацыя і абагульненне матэрыялу;

метад моўнага эксперыменту (у працэсе анкетавання вучняў);

аналіз атрыманай інфармацыі.

## Біяграфія Ірыны Антонаўны Войткі

Ірына Антонаўна Войтка нарадзілася 23 кастрычніка 1961 года ў вёсцы Каралін Зэльвенскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У 1979 годзе скончыла Каралінскую сярэднюю школу, у 1984 годзе філалагічны факультэт БДУ. Пасля размеркавання настаўнічала ў Цяглевіцкай сярэдняй школе Зэльвенскага раёна. Потым з мужам пераехала ў Слонім. Мае двух сыноў.[5, с. 40]

Паэтычную натуру Ірыны Антонаўны разгледзелі настаўнікі. Яе выбар беларускай філалогіі быў добра асэнсаваным. У БДУ І.Войтка вучылася ў паэтаў і навукоўцаў Алега Лойкі, Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Таццяны Шамякінай.

Вершы паэткі друкаваліся ў "Чырвонай змене", зэльвенскай газеце "Праца". Потым на старонках газет "ЛіМ", "Настаўніцкая газета", "Слонімскі веснік", "Гродзенская праўда", у часопісах "Маладосць" (1992 – 2007), "Роднае слова" (1998), "Пралеска" (2005), дзіцячым часопісе "Вясёлка", у калектыўных зборніках паэзіі "Золак над Шчарай" (1994), "Паэтычная Слонімшчына" (2000), "Пад гукі Паланэза" (2005), "Зоры над Зяльвянкай" (2008), у хрэстаматыі для старшакласнікаў "Сэрцам роднага слова краніся" (1998), зборніку гістарычнай літаратуры "Бацькаўшчына" (2000), "Дзень паэзіі 2006", у літаратурных альманахах Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі "На Нёманскай хвалі" і ў іншых выданнях.

Беларуская паэтка са Слоніма, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ірына Антонаўна Войтка з'яўляецца аўтаркай трох паэтычных зборнікаў: "Спасціжэнне" (2003), "Пагляджу вачамі неба" (2010), "Кранаюся вечнасці" (2021). (Дадатак 1) Вершы І.Войткі перакладаліся на рускую і ўкраінскую мовы. [6]

І.А.Войтка з 2002 г. па 2019 год – загадчык дзяржаўнай установы адукацыі "Яслі-сад № 3 г.Слоніма", які працуе ў накірунку "рэалізацыя адукацыйнай мадэлі этнасад". Укараніла ў работу ўстановы тэхналогіі развіваючага навучання для вывучэння роднай мовы ў дашкольнікаў. Стварыла ў садку этнаграфічны музей. У 2003 г. яслі-сад № 3 г.Слоніма заняў 3 месца ў вобласці

ў конкурсе беларускамоўных дашкольных устаноў “Зорачка”. Вопыт работы калектыву прэзентаваўся ў навукова-метадычным часопісе “Пралеска”.

Узнагароджана Ганаровай граматай галоўнага упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага выканаўчага камітэта за значныя дасягненні ў літаратурна-творчай і грамадска-культурнай дзейнасці. З 2006 г. кіруе літаратурным аб’яднаннем імя Анатоля Іверса пры газеце “Слонімскі веснік”. Члены літаратурнага аб’яднання ладзяць творчыя сустрэчы і вечары, праводзяць прэзентацыі кніг, юбілеі паэтаў-землякоў, падтрымліваюць творчыя сувязі са сталічнымі і абласнымі пісьменнікамі, праводзяць сустрэчы ў навучальных установах, бібліятэках горада, іх творы змяшчаюцца ў абласным і рэспубліканскім друку.[6] (Дадатак)

У канцы 2020 года ў мінскім выдавецтве “Энцыклапедыкс” выйшла чарговае выданне энцыклапедыі “Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь. Адукацыя 2020”. У кнігу ўвайшлі біяграфіі работнікаў сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, тых, хто дамогся прафесійных і дзелавых поспехаў сваімі дасягненнямі. У энцыклапедыі прадстаўлена і біяграфія І.А.Войткі як педагога і паэтэсы. (Дадатак 2)

Творчасць Ірыны Войткі

Лірыка Ірыны Войткі напоўнена яркімі назіраннямі з жыцця сучаснага чалавека, разважаннямі аб сэнсе быцця, аб пачуццях і жарсцях чалавечых. Яе паэзія па-філасофску глыбакадумная і інтымна-пранікнёная, звонкая і празрыстая, і ў той жа час поўная эфектных метафар. Але адметнай асаблівасцю ўсіх твораў паэткі з’яўляецца тое, што ў іх адчуваецца подых роднай зямлі, гучыць, пераліваецца на ўсе лады голас роднага краю.[6] І з усёй адказнасцю можна заключыць, што вершы Ірыны Войткі, пра што б ні хацела ў іх сказаць паэтка – гэта гімны роднай зямлі.

Любы мой, родны Слонім,
горад майго жыцця,
тут на тваіх далонях

роду майго працяг.[1, с. 88] (Дадатак 4)

Ірына Антонаўна выступае з вершамі ў бібліятэках, школах, навучальных установах і працоўных калектывах Слоніма. (Дадатак 3) Навуковае грамадства гімназіі № 1 г.Слоніма "Пошук" тройчы тэмай навукова-даследчых работ абірала творчасць Ірыны Войткі, стварыла ў інтэрнэце блог "Зала Ірыны Войткі". Навучэнцы ліцэя № 1 г.Слоніма ўдзельнічалі ў абласной канферэнцыі па беларускай літаратуры з тэмай: "Патрыятычныя матывы ў творчасці слонімскай паэткі Ірыны Войткі".

Вядомы беларускі літаратар Мікола Арочка, аналізуючы першы зборнік І.Войткі, пісаў пра яе: "Паэтка з Боскай ласкі, прыроджана ўдумлівая, з уласным праніклівым лірычным голасам і з глыбока чуйнай душой, сваім непаўторным песнедарам, нібы прамытым крынічнай чысцінёй". Пісьменнік Віктар Гардзей адзначыў: "Яе творы прываблiваюць сур'ёзным пошукам жыцця, пробай зразумець прызначэнне чалавека на зямлі, праз сваё ўласнае "я" спасцігнуць касмічныя тайны светабудовы. У аснове яе паэзіі глыбокі лірызм, шчырае непадробнае пачуццё, ёй падуладны яркія алітэрацыі, сакавітыя свежыя метафары і іншыя мастацкія тропы". Пісьменнік Іван Сяргейчык пісаў пра Ірыну Антонаўну Войтку наступнае: "Лірычная жаночая душа, умела выкарыстоўваючы тонкія пачуцці, заварожыць цябе любоўю да прыроды роднага краю, прымусіць суперажываць разам з ёю, гаворачы пра каханне, навее прыемны роздум, разважаючы аб жыцці і чалавечым шчасці. Ірына Войтка – паэт-псіхолаг. Яна ўмее ўпраўляць людскімі пачуццямі. Раскрываючы перад чытачом сваю душу, яна падпарадкоўвае сабе ягоную". Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Уладзімір Саламаха прызнаўся: "Асабіста мяне вершы І.Войткі натхнілі напісаць эсэ".

Тэматыка яе твораў разнастайная: аб роднай прыродзе, прыгажосці і вечнасці жыцця, аб продках і маці, аб духоўнасці і вечных ісцінах.

Патрыятычная тэма займае вялікае месца ў творчасці І.Войткі. Творы паэткі спрыяюць адраджэнню духоўнасці, выхаванню грамадзяніна і патрыёта, які паважае і шануе традыцыі свайго народа, ганарыцца яго духоўнай

культурай. Вобраз Радзімы ў І.А.Войткі месціць у сабе малую радзіму: месца, дзе нарадзілася і расла, а таксама горад, у якім жыве ўжо шмат гадоў.

Я на Зэльвеншчыне нарадзілася,
З гэтым краем навек парадніласся,
Набылася я тут, нахадзілася
І гасцінцамі тут нагасцілася. (“Гімн Зэльвеншчыне”) [3, с. 6] (Дадатак 5)

Мой Каралін! Мой родны краю!
Красы прыроднае крыніца.
Дазволь табе мне пакланіцца:
Любоў мне сэрца напаўняе. (“Караліну”) [1, с. 34] (Дадатак 6)

У творчасці Ірыны Войткі прысутнічае цэласны вобраз Слоніма. Для паэткі галоўнае, каб наш горад быў прыгожым, яркім, незвычайным, ціхім, мірным, спакойным. Гаворачы пра Слонім, нельга не згадаць цудоўную раку Шчару. [4]

Ціхая мудрая Шчара,
Весніца ранняй вясны!
Ты скрозь лугі і імшары
Коціш глыбокія сны.
І навяваеш пяшчоту,
І абуджаеш любоў. [2, с. 75] (Дадатак 7)

Вершы “Маёй радні”, “Маці”, “Сыну”, “Сыну Алегу”, “Бацькам”, “Каваль”, “Брату”, “Алёне”, “У душы майго сына” прысвечаныя продкам, бацькам, сынам, кранаюць да самай глыбіні душы. (Дадатак 8)

Немалаважнае месца ў лірыцы паэтэсы займаюць вершы аб знамянальных падзеях Беларусі і Слоніма. У зборніках Ірыны Антонаўны можна сустрэць вершы “На будоўлю Спаса-Праабражэнскага сабора ў Слоніме”, “Да сусветнага дня паэзіі”, “Да 90-гадовага юбілею Слонімскага краязнаўчага музея”, “Помніку воіна-вызваліцеля ў Слоніме”, “У Хатыні”, “На былой плошчы Горкага”, “Да свята Беларускага пісьменства ў Слоніме ў 2019 годзе”. Яе

хвалююць думкі аб сучаснай Беларусі, аб гістарычнай памяці, аб душы чалавека. (Дадатак 9)

Разглядаючы напрамкі творчасці паэткі, я ўразілася таму, як ярка і пачуццёва Ірына Антонаўна раскрывае кожную тэму. Чалавек рана ці позна задумваецца над вечнымі філасофскімі пытаннямі: для чаго, навошта я з'явіўся на гэтым свеце? І вырашыць іх можна толькі тады, калі шчыра пачынаеш аналізаваць пражытае жыццё.

Пагляджу вачамі неба
на сваё жыццё і ваша…
На жыццё, відаць, і трэба
нам глядзець вачамі неба. [2, с. 4]

Шукаю Бога ў свеце,
шукаю яго ў людзей,
але найцяжэй знайсці Бога ў сабе. [2, с. 24]

Не стагоддзя прашу
і не вечнасці – чалавечнасці.
Як у бацькі майго – дабрыні.
Як у маці маёй – цеплыні.
Як у храма майго – вышыні.
Як у Бога майго – чысціні. [2, с. 72]

Паэзія Ірыны Антонаўны Войткі развівае духоўны свет чалавека, робіць яго багацейшым. Вершы сваёй прыгожай, жывой мовай дапамагаюць чалавеку з годнасцю перамагаць тыя жыццёвыя выпрабаванні, якія прыгатаваў яму лёс.

**Анкетаванне як метад абгрунтавання актуальнасці дадзенага праекта**

Каб пераканацца ў актуальнасці дадзенага праекта для сучаснага пакалення, было праведзена анкетаванне сярод вучняў майго класа.

У анкетаванні прынялі ўдзел 25 чалавек. Вынікі прадстаўлены ў дыяграме ніжэй.

Анкета

1. Ці ведаеце Вы паэтаў-землякоў?

На гэтае пытанне станоўча адказалі 13 чалавек.

2. Калі так, пералічыце іх.

Вучні назвалі такіх паэтаў. як І.Войтка, А.Лойка, А.Якімовіч.

3. Ці ведаеце Вы паэтэсу Ірыну Войтку?

18 вучняў адказалі, што чулі пра такую паэтку.

4. Ці знаёмы Вы з творчасцю Ірыны Войткі?

Амаль ніхто з дзяцей не знаёмы з творчасцю паэтэсы.

5. Хацелі б Вы больш даведацца пра жыццё і творчасць Ірыны Войткі?

Вельмі задаволілі адказы маіх аднакласнікаў тым, што ім было б цікава даведацца пра жыццё і творчасць І. А. Войткі. У сувязі з гэтым было вырашана стварыць вэб-сайт, дзе можна будзе пазнаёміцца з біяграфіяй і вершамі паэтэсы.




Высноaccess

Выканаўшы пастаўленыя ў праекце задачы, я зрабіла наступныя высновы.

Дадзеная даследчая праца стала для мяне цікавай і карыснай, таму што я асабіста пазнаёмілася з паэткай-зямлячкай, узбагаціла сябе цікавымі звесткамі пра яе. Творчасць І.А.Войткі непарыўна звязана з яе жыццём, яна шчырая, калі піша пра тое, што яе хвалюе.

Я прааналізавала зборнікі вершаў і вылучыла найбольш тыповыя тэмы і матывы яе творчасці: тэма Радзімы, тэма любові да бацькоў і сям'і ўвогуле, тэма памяці, філасофская лірыка.

Праведзенае анкетаванне даказвае, што імя паэткі-зямлячкі мала каму вядома, школьнікам не вядомыя яе вершы.

Я навучылася аналізаваць паэтычны тэкст, набыла навыкі даследчай дзейнасці, а таксама вопыт выступлення перад аўдыторыяй.

У бібліятэцы я прачытала нататкі пра паэтку ў газетах, узяла ў яе інтэрв'ю. (Дадатак 10, 11)

Створаны вэб-сайт, у якім размешчана інфармацыя пра паэтку. На сайце можна пазнаёміцца з яе біяграфіяй і вершамі. (Дадатак 13)

Прыгажосць і чароўнасць лірыкі І.А.Войткі ў яе праўдзівасці, шчырасці і сардэчнасці. У яе праніклівых вершах захаваныя карціны роднай прыроды, яе душа і глыбокая любоў да Радзімы.

Лічу, што практычная значнасць заключаецца ў тым, што сабраны матэрыял і матэрыял, размешчаны на вэб-сайце, у якасці пашырэння кругагляду і фарміравання светапогляду навучэнцаў можа быць выкарыстаны на ўроках літаратуры, на тэматычных канферэнцыях, літаратурных конкурсах, віктарынах. Гатовы матэрыял будзе прадстаўлены ў школьную бібліятэку, з ім можна будзе выступіць на вечары, прысвечаным паэтам-землякам. У гэтым я бачу грамадскую значнасць літаратурнай краязнаўчай дзейнасці.

Далучэнне да духоўна-культурных каштоўнасцей малой радзімы цесна звязана з адкрыццём літаратуры роднага краю. Літаратура дапамагае спазнаць край, а край – літаратуру і тых, хто яе ставарае. Біяграфія пісьменніка, яго лёс і лёс яго лірычных герояў складаюць аснову літаратурнага краязнаўства.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Войтка, І. А. Кранаюся вечнасці: вершы / І. А. Войтка. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2021. – 132 с.
2. Войтка, І. А. Пагляджу вачамі неба: вершы / І. А. Войтка. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010. – 80 с.
3. Войтка, І. А. Спасціжэнне: вершы / І. А. Войтка. – Слонім: ГАУПП “Слонім. друк.”, 2003. – 40 с.
4. Зала Ірыны Войткі [Электронны рэсурс] / Рэжым доступа: http://slonimschina.narod.ru/Slonimschina/I_Vojtka.html – Дата доступа: 17.02.2022
5. Золак над Шчарай: [Літаратурна-публіцыстычны зборнік членаў Слонімскага літаб’яднання] / Слонімскае літаб’яднанне. – Слонім: “Слонімская ўзбуйненая друкарня”, 1994. – 120 с.
6. Юбілей слонімскай паэтэсы Ірыны Войткі // Слонімскі веснік [Электронны рэсурс] / Рэжым доступа: https://www.slonves.by/163047-2/ – Дата доступа: 17.02.2022

Дадатак 1


Ірына Войтка
ПАГЛЯДЖУ
ВАЧАМІ НЕБА


Ірына ВОЙТКА
Спасціжэнне


Ірына ВОЙТКА
Вершы
КРАНАЮСЯ
ВЕЧНАСЦІ

Дадатак 2


КТО ЕСТЬ КТО
В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ
WHO IS WHO
IN THE REPUBLIC OF BELARUS
ОБРАЗОВАНИЕ
2020

Дадатак 3


















Дадатак 4



## СЛОНІМУ

Любы мой, родны Слонім,
горад майго жыцця,
тут на тваіх далонях
роду майго працяг.

Новых будоўляў абшары,
веліч тваёй даўніны.
Сэрца шчымліва ўзрушаюць
ранкам сабора званы.

Будзе стагоддзямі крочыць,
бы па прасторах прагрэс,
велічны, вечны, прарочы
слонімскі гімн – паланэз.

Будзе адвечная Шчара
між паясамі мастоў
песняй жывою і марай
плыць у бясконцасць вякоў.

Любы мой, родны  Слонім,
стаў ты мне домам другім.
Тут на тваіх далонях –
лёсу майго берагі.

Дадатак 5



# ГІМН ЗЭЛЬВЕНШЧЫНЕ

Я на Зэльвеншчыне нарадзілася,
з гэтым краем навек параднілася.
Набылася я тут, нахадзілася
і гасцінцамі тут нагасцілася.

Прыпеў:
Мая Зэльвеншчына, мая Зэльвеншчына,
пахнуць травы твае мне здалёку.
Гарызонты твае вабяць вока,
дыхаць лёгка табой і глыбока.

Тут дарожкі мае не прыпыняцца,
хата родная зноў мне адчыніцца.
Моцнай прагай, няведамай сілаю
да цябе зноў прыеду я, мілая.

Прыпеў:
Мая Зэльвеншчына, мая Зэльвеншчына,
пахнуць травы твае мне здалёку.
Гарызонты твае вабяць вока,
дыхаць лёгка табой і глыбока.

Ты багата гісторыяй, спадчынай.
Тут абрады народа не страчаны.
У пашане тут буднямі, святамі
песня дзіўная, мова матчына.

Прыпеў:
Мая Зэльвеншчына, мая Зэльвеншчына,
пахнуць травы твае мне здалёку.
Гарызонты твае вабяць вока,
дыхаць лёгка табой і глыбока.

Дадатак 6



## КАРАЛІНУ

Дарога між таполяў дахаты –
Лясы, пагоркі і даліны.
К табе я, быццам птах крылаты,
імчу ў палёце жураўліным.

Мой Каралін! Мой родны краю!
Красы прыроднае крыніца.
Дазволь табе мне пакланіцца:
любоў мне сэрца напаўняе.

Дадатак 7

***

Ціхая, мудрая Шчара,
весніца ранняй вясны!
Ты скрозь лугі і імшары
коціш глыбокія сны.
І навяваеш пяшчоту,
і абуджаеш любоў.
Зноў падыходжу употай
я да тваіх берагоў.
Болей не бачу я выйсця,
як на цябе мне глядзець.
Восені леташняй лісце
будзе на хвалі ляцець.
Ціхая, мудрая Шчара,
весніца ранняй вясны...

Дадатак 8



# КАВАЛЬ

Жыў на зямлі чалавек і каваў жалеза.
І называлі яго Кавалём. І была ў яго кузня.
І вялі да яго каваць коней, і ехалі гаспадары.
І быў ён майстрам на ўсе рукі.
І гарэў у кузні горн, і трашчаў вугаль.
А молат Каваля стукаў і стукаў рознымі пералівамі
з раніцы і да вечара на ўсю ваколіцу.
І дзверы кузні былі адчынены для ўсіх…
Бо стаяла яна на скрыжаванні дарог:
хто заходзіў па справе, хто вады напіцца,
а хто проста паглядзець. І было ў кузні людна.
А калі Каваль заставаўся адзін,
ён выходзіў з жалезнага хораму
і глядзеў на заход сонца.
Браў шырокую кварту вады
і мыў ўчарнелыя за дзень твар і рукі.
А побач, як салдаты ў рад, стаялі жалезныя прылады,
якія ён зрабіў за дзень.
Ён браў маленькую дачушку на рукі,
якая гуляла цэлы дзень ля кузні, і ішоў дадому.
А Кавалём гэтым быў мой бацька, а дзяўчынкаю я.

Дадатак 9






## ДА СВЯТА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА Ў СЛОНІМЕ Ў 2019 ГОДЗЕ

Свята пісьменства, свята пісьменства –
гэта тваё і маё падабенства.
Гэта з вытокаў прамая дарога
да слова, да песні, да кнігі, да Бога.
Гэта пяром узаранае поле.
Гэта супольнасць ад хлеба і солі.
Гэта разгорнуты аркуш душы –
думкай жывою твары і пішы.
Гэта развага, гэта маленнне.
Гэта адкрытага сэрца сумленне.
Гэта цяжкая духоўная праца,
каб Мовіць,
каб Верыць
і ў Кнігах здзяйсняцца.

Дадатак 10





Дадатак 11

Інтэрв’ю з Ірынай Антонаўнай Войтка

Паліна: У якім узросце Вы пачалі пісаць вершы?

Ірына Антонаўна: Першыя вершы напісала ў трэцім класе. Настаўніца заўважыла маё незвычайнае ўяўленне.

Паліна: Чым яшчэ захапляліся ў школе?

Ірына Антонаўна: У школе чытала са сцэны вершы, удзельнічала ў драматычным гуртку, была рэдактарам насценнай газеты "Камсамольскі пражэктар".

Паліна: Які быў першы верш, напісаны Вамі?

Ірына Антонаўна: Першы верш быў прысвечаны матулі да 8 Сакавіка.

Паліна: Што або хто Вас натхняе пры напісанні вершаў?

Ірына Антонаўна: На напісанне вершаў натхняюць добрыя падзеі, прыгожыя людзі і іх годныя справы, хараство навакольнага свету, а таксама музыка.

Паліна: Які Ваш любімы пісьменнік або паэт?

Ірына Антонаўна: Любімы паэт Сяргей Ясенін.

Паліна: Якая тэматыка вершаў у Вашай творчасці пераважае?

Ірына Антонаўна: Лічу, што ў маёй творчаці пераважае тэма любові да роднай зямлі, яе людзей.

Паліна: Які з вершаў самы любімы?

Ірына Антонаўна: Любімы верш "Роднае слова", які змешчаны ў хрэстаматыі для старшакласнікаў, "Сэрцам роднага слова краніся", перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы.

Паліна: Чым Вы займаецеся на пенсіі?

Ірына Антонаўна: На пенсіі летам жыву ў бацькоўскай хаце на Зэльвенскім моры, там маё натхненне. Пішу зараз прозу, удзельнічаю ў розных праектах Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі,

супрацоўнічаю з рэдакцыямі газет "Слонімскі веснік", "Праца", з раённай бібліятэкай імя Я.Коласа, кірую літаратурным аб'яднаннем імя А.Іверса пры газеце "Слонімскі веснік". Выдала сваю трэцюю кнігу.

Паліна: Ці лічыце Вы сябе шчаслівым чалавекам?

Ірына Антанаўна: Думаю, што тварыць – гэта шчасце. Тым больш, калі ёсць зваротная сувязь, калі цябе разумеюць і твае творы запатрабаваныя.

Паліна: Над чым зараз працуеце?

Ірына Антанаўна: Працую над серыяй апавяданняў.

Паліна: Вялікі дзякуй за размову!

Дадатак 12

https://strokalena89.wixsite.com/irinavojtko

